# Ад банка – для бібліятэкі

***Добрай традыцыяй стала супрацоўніцтва ААТ «БПБ-Ашчадбанк» з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. «КГ» распавядала пра каштоўны падарунак – два выданні Казіміра Семяновіча «Вялікае мастацтва артылерыі» (1650 г. на лацінскай і 1651 г. на французскай мовах), якія бібліятэка атрымала ад банка ў 2012 г.***

Нядаўна ж, дзякуючы дамове прэзідэнта, старшыні праўлення ПАТ «Ашчадбанк» Германа Грэфа з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам, у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі з'явіўся шэраг бізнес-выданняў. Таксама бібліятэка атрымала права доступу да электроннай бібліятэкі Ашчадбанка. 25 ліпеня ў НББ адбылася цырымонія перадачы кніг і прэс-канферэнцыя з удзелам старшыні праўлення ААТ «БПБ-Ашчадбанк» Ігара Мяркулава і першага намесніка дырэктара бібліятэкі Алены Даўгаполавай.

А. Даўгаполава адзначыла, што фонды НББ налічваюць 10 мільёнаў кніг і штогод павялічваюцца на 200 тысячаў найменняў (з іх каля 20 % складаюць дарункі юрыдычных і фізічных асобаў). Паслугамі бібліятэкі карыстаюцца 174 тысячы чалавек. Ад імя адміністрацыі і чытачоў А. Даўгаполава выказала словы ўдзячнасці кіраўніцтву банка за чарговы дар і спадзяванне на далейшае супрацоўніцтва. Напрыканцы прэс-канферэнцыі І. Мяркулаву быў уручаны сімвалічны падарунак ад бібліятэкі – факсіміле «Буквара», 400-годдзе выдання якога адзначаецца сёлета, а таксама чытацкі білет.

Бібліяграфічная інфармацыя новых паступленняў увойдзе ў электронны каталог НББ і зводны электронны каталог бібліятэк Беларусі. З кнігамі, у тым ліку ў электронным фармаце, можна азнаёміцца ў чытальнай зале.

*Наталі КУПРЭВІЧ, фота аўтара*



*Ігар Мяркулаў і Алена Даўгаполава*